УДК 94.476

**В. А. Пілецкі,** доктар гістарычных навук, дацэнт
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
вул. Акадэмічная, 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 673 85 56, ekonhistbel@mail.ru

# НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ ДА ГІСТОРЫІ АБРАДУ АБВЯШЧЭННЯ Ў ХРЫСЦІЯНСТВЕ

Праведзена даследаванне праблемы зніжэння статусу абраду абвяшчэння ў гісторыі хрысціянскай царквы. Адзначана, што адзін з найстаражытных абрадаў, які з'явіўся ў самым пачатку станаўлення хрысціянскай рэлігіі ды існаваў у дзейнасці царквы на працягу стагоддзяў, меў спецыяльна распрацаваныя формы правядзення, шырока ўзгадваўся ў літаратуры розных эпох, у цяперашні час называецца «практыкай падрыхтоўкі да хрышчэння», якая займае даволі абмежаваны перыяд па часе правядзення і прымяняецца, у тых ці іншых сітуацыях, даволі сімвалічна. Разгледжаны змест праграмы катэхізацыі. Паказаны асаблівасці сэнсавага напаўнення тэрмінаў «абвяшчэнне» і «катэхізацыя», іх падабенства і адрозненні. Зроблены высновы аб гістарычных умовах і прычынах зніжэння статусу катэхізічнай абраднасці да ўзроўню «прадхрышчэнскай практыкі».

**Ключавыя словы:** хрысціянства; абвяшчэнне; навучанне; катэхізацыя; азбука веры; сакрамэнты; памазанне; хрышчэнне; пакаянне; пост; споведзь; дагматы; літургія.
Бібліягр.: 24 назвы.

**V. A. Piletsky,** Doctor of Historical Sciences, Associate Professor
The State Scientific Institution "The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus",
1 Akademichnaya Str., 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (29) 673 85 56, ekonhistbel@mail.ru

# SOME NOTES ON THE HISTORY OF THE RITE OF ANNOUNCEMENT IN CHRISTIANITY

A study of the problem of reducing the status of the rite of announcement in the history of the Christian Church was conducted. It is noted that one of the most ancient rites, which appeared at the very beginning of the formation of the Christian religion and existed in the activity of the church for centuries, had specially developed forms of performance, was widely mentioned in the literature of different eras, and is currently called "practice of preparation for baptism", which occupies a rather limited period of time and is applied, in certain situations, quite symbolically. The content of the catechesis program was reviewed. The features of the semantic content of the terms "announcement" and "catechization", their similarities and differences are shown. Conclusions about the historical conditions and reasons for the reduction of the status of the catechetical rite to the level of "pre-baptismal practice" are made.

**Key words:** Christianity; announcement; teaching; catechism; alphabet of faith; sacraments; anointing; baptism; repentance; fasting; confession; dogmas; liturgy.
Ref.: 24 titles.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Большасць сучасных інфармацыйных рэсурсаў (як навуковых, так і рэлігійных) называюць абрад абвяшчэння (рус. *оглашения*) практыкай падрыхтоўкі да хрышчэння. Разам з тым гэтая «практыка» існуе амаль усю гісторыю хрысціянства і мае вялікую колькасць палажэнняў і ўстановак (старажытных літаратурных сведчанняў [1—4]) аб тым, як яе патрэбна праводзіць, што яна азначае, які яе змест ды інш. Ці мае яна права называцца абрадам? Так, канешне.

І ўсё ж «практыка» ці «абрад»? Адказ на пастаўленае пытанне знаходзім у інфармацыйным рэсурсе «Праваслаўная энцыклапедыя» (курсіў тут і далей наш — *В. П.*): *«…оглашение, …было прежде отдельным обрядом, теперь непосредственно предшествует Крещению…»* [5]. Дык

© Пілецкі В. А, 2023

чаму ж старажытны «абрад» абвяшчэння (рус. *оглашения*), які існуе амаль увесь перыяд гісторыі хрысціянства, на сёння ператварыўся ў «практыку» падрыхтоўкі да хрышчэння? Чым абумоўлена зніжэнне статусу выключна важнай для канфесіі справы, якая суправаджае яе амаль усю гісторыю? Пра гэта ды іншае мы і паспрабуем паразважаць у дадзеным матэрыяле. А таксама аб тым, напрыклад, хто такія «абвешчаныя» (царк. *оглашении*). Які сэнс укладзены ў названы тэрмін? Што такое «катэхізацыя»? Якія яе задачы?

Актуальнасць праблемы звязана са значным пашырэннем ролі хрысціянства ў жыцці сучаснага еўрапейскага грамадства. Разбурэнне атэістычнай парадыгмы (пачынаючы з 90-х гадоў XX стагоддзя), што існавала ў ідэалогіі постсавецкага абшару, вызвала бурны рост цікавасці грамадства да агульначалавечых хрысціянскіх каштоўнасцей. Роля хрысціянскай этыкі і філасофіі займае ўсё больш значнае месца ў свядомасці насельніцтва еўрапейскіх краін. Усё гэта дыктуе неабходнасць больш глыбокага даследавання гісторыі хрысціянства, а сярод іх і праблемы зніжэння статусу царкоўнага абраду абвяшчэння. Выкананая праца, безумоўна, паспрыяе адэкватнаму адлюстраванню гістарычнай рэчаіснасці і паглыбіць грамадскае разуменне мінуўшчыны, што дазволіць выкарыстаць выяўленыя асаблівасці сацыякультурных працэсаў у навуковай літаратуры, педагагічнай практыцы і пры стварэнні даведачных выданняў.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Зніжэнне статусу абраду абвяшчэння не разглядалася папярэдняй гістарыяграфіяй у якасці асобнай навуковай праблемы. Аднак у літаратуры ёсць нямала згадак пра ўказаны абрад (з таго ці іншага пункту гледжання). Найперш маюцца шматлікія старажытныя катэхізічныя тэксты, што выконвалі ролю дапаможнікаў па катэхізацыі язычнікаў [6—8]. Ёсць літургічныя (богаслужэбныя) творы: малітвы, вершы, песнапенні (рус. *стихири*). Ну і, канешне, манаграфічныя даследаванні, сярод якіх манаграфіі царкоўнага гісторыка XIX стагоддзя А. І. Алмазава («Гісторыя чынапаследаванняў: хрышчэння і мірапамазання» [9]); прафесара ўніверсітэта святога Фамы (штат Мінесота, ЗША) П. Л. Гаўрылюка («Гісторыя катэхізацыі ў старажытнай царкве» [10]); члена Французскай акадэміі, тэолага і гісторыка Жана Даніэлу («Катэхізацыя ў першыя стагоддзі» [11]) ды інш.

Гістарыяграфічны аналіз названых манаграфічных прац зроблены намі раней. А самі працы названых вучоных пакладзены ў аснову праведзенага ў гэтым артыкуле даследавання.

Агляд манаграфіі Жана Даніэлу аўтар апублікаваў асобным артыкулам [12], а гістарыяграфічны матэрыял па кнігах А. І. Алмазава і П. Л. Гаўрылюка ўключаны ў даклад, агучаны на канферэнцыі, што адбылася 26—27 кастрычніка 2023 года ў ГДУ імя Ф. Скарыны (Пілецкі, В. А. Пра гістарыяграфію XIX—XXI стст. абраду абвяшчэння ў гісторыі хрысціянства // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX—XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы (матэрыял знаходзіцца ў друку)).

Крыніцамі для вывучэння заяўленай тэматыкі паслужылі шматлікія апавядальныя (наратыўныя) і царкоўна-дакументальныя крыніцы. Гэта найперш працы айцоў царквы, катэхізічныя і дыдактычныя тэксты, апалагетыка, ерэтычныя творы, хрысціянскія дактрынальныя, богаслужэбныя матэрыялы. Некаторыя з іх выкарыстоўваліся і як крыніца, і як гістарыяграфічны аб'ект.

Пры распрацоўцы праблемы і напісанні артыкула акрамя спецыяльна-гістарычных (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны) аўтар выкарыстоўваў агульнанавуковыя метады даследавання.

Мэтай артыкула з'яўляецца высвятленне пытання, чаму старажытны абрад, які існаваў у дзейнасці царквы на працягу стагоддзяў, меў спецыяльна распрацаваныя формы правядзення, быў шырока прадстаўлены ў літаратуры розных эпох, у цяперашні час называецца «практыкай падрыхтоўкі да хрышчэння», якая займае даволі абмежаваны перыяд па часе правядзення і прымяняецца, у тых ці іншых сітуацыях, даволі сімвалічна (і схематычна); раскрыццё зместу праграмы катэхізацыі, паказ значэння тэрмінаў «абвяшчэнне» і «катэхізацыя», а таксама іх падабенства і адрозненні.

Рэпазіторый БарДУ

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Пачнём з пытання, сфармуляванага намі адным з апошніх: якімі былі задачы і змест катэхізацыі? Адказ на яго будзе наступны. Галоўная задача — змяніць свядомасць, вобраз жыццядзейнасці, комплекс маральных, культурных і светапоглядных арыенціраў чалавека, які знаходзіўся ў палоне язычніцкага светаўспрымання, паставіць яго на шлях хрысціянізацыі. Што да зместу катэхізацыйнай падрыхтоўкі ў поўным (ідэальным) выглядзе, то яна ўключала найперш базавыя (элементарныя) веды, якія знаёмы любому хрысціяніну, валоданне якімі (а таксама выкананне патрабаванняў і правіл, заключаных у іх) і з’яўляецца сведчаннем наяўнасці сапраўднага хрысціяніна.

Па-першае, вучылі асновам веры (завучваліся на памяць), якія сфармуляваны ў так званым «Сімвале веры» (задакументаваным пераліку асноватворных дагматаў хрысціянскага веравучэння). Акрамя гэтага, у якасці першаступеннага вучылі малітву «Ойча наш» і засвойвалі «Закон Божы» (Дэкалог) у выглядзе «Дзесяці біблейскіх запаведзяў».

***«Символ веры» на русском языке:***

– Верую в единого Бога Отца, Вседержителя, Творца неба и земли, всего видимого и невидимого.

– И в единого Господа Иисуса Христа, Сына Божия, Единородного, рожденного от Отца прежде всех веков: Света от Света, Бога истинного от Бога истинного, рожденного, не сотворенного, одного существа с Отцом, Им же все сотворено.

– Ради нас людей и ради нашего спасения сшедшего с небес, и принявшего плоть от Духа Святого и Марии Девы, и ставшего человеком.

– Распятого же за нас при Понтийском Пилате, и страдавшего, и погребенного.

– И воскресшего в третий день согласно Писаниям.

– И восшедшего на небеса, и сидящего по правую сторону Отца.

– И снова грядущего со славою, чтобы судить живых и мертвых, Его же Царству не будет конца.

– И в Духа Святого, Господа, дающего жизнь, от Отца исходящего, с Отцом и Сыном сопокланяемого и прославляемого, говорившего через пророков.

– В единую святую, соборную и апостольскую Церковь.

– Признаю одно крещение для прощения грехов.

– Ожидаю воскресения мертвых, и жизни будущего века. Аминь [13].

***Десять заповедей Закона Божиего:***

1) Я Господь, Бог твой; да не будет у тебя других богов пред лицем Моим.

2) Не делай себе кумира и никакого изображения того, что на небе вверху, и что на земле внизу, и что в воде ниже земли; не поклоняйся им и не служи им.

3) Не произноси имени Господа, Бога твоего напрасно.

4) Помни день субботний, чтобы святить его; Шесть дней работай и делай всякие дела твои, а день седьмой — суббота Господу, Богу твоему.

5) Почитай отца твоего и мать твою, чтобы продлились дни твои на земле.

6) Не убивай.

7) Не прелюбодействуй.

8) Не кради.

9) Не произноси ложного свидетельства на ближнего твоего.

10) Не желай дома ближнего твоего; не желай жены ближнего твоего, ни раба его, ни рабыни его, ни вола его, ни осла его, ничего, что у ближнего твоего [14].

Другім змястоўным накірункам пры навучанні вернікаў перад хрышчэннем з’яўляюцца абавязкі хрысціяніна ў адносінах да Бога, да бліжніх яму людзей і, адпаведна, да сябе. Сярод іх найпершае — гэта «адносіны з Госпадам». Яны падзяляюцца на два канцэнтры: «унутранае» і «вонкавае» богапачытанне.

***Внутреннее богопочитание:***

– Веровать в Бога и иметь правильный образ мыслей о Боге и предметах божественных.

– Осознавать Его вездеприсутствие и действовать по жизни во всем с этим осознанием.

– Иметь страх Божий.

– Надеяться на Бога.

– Любить Бога.

Репозиторий БарГУ

– Повиноваться Богу.
– Поклоняться Богу.
– Прославлять Бога как всесовершенного.
– Благодарить Бога как Творца, Промыслителя и Спасителя.
– Призывать Бога во всяком добром начинании.

***Внешнее богопочитание:***
– Участвовать в общественном богослужении (в том числе в таинствах Церкви), установленном от Бога и учреждённом Церковью.
– Исполнять Божественные и церковные установления, святые каноны (заповеди).
– К особым видам внешнего богопочитания относятся: публичное исповедание веры в Бога (несмотря на угрозы насилием), клятва (присяга) и обет [15].

Адносіны хрысціяніна да бліжніх яму людзей і да самога сябе прадстаўлялі сабой трэці сэнсавы канцэнтр, які павінны былі засвоіць будучыя вернікі.

***Обязанности христианина по отношению к ближним***
*К ближним вообще*
– Любить и почитать ближних, особенно наших близких, начиная с родителей.
– Не вредить жизни ближних, а наоборот, насколько возможно, оберегать их жизнь и благосостояние.
– Не вредить чистоте их нравов.
– Не присваивать себе чужую собственность, а наоборот, благотворить.
– Не вредить им словом.
– Даже не желать вредить им.

*Примечание.* Перечисленные обязанности по отношению к ближним, можно назвать самыми общими. Более частное их применение описывается в Священном Писании и разбирается в разделе нравственного богословия.

По отношению к ближним-христианам, перешедшим в мир иной, христианин должен также проявлять любовь и почтение.

*К прославленным святым*
– Почитать их.
– Прибегать к их ходатайству.
– Узнавать их жизнь и труды, стараясь всеми силами подражать им в чувствах и делах.
– Искать и стремиться к духовному соединению с ними.

*К остальным усопшим*
– Способствовать похоронить, если есть нужда.
– Приносить за них молитвы, жертвы и милостыни.
– Никак не злословить и не осуждать.
– Исполнять их последнюю добрую волю.
– С благодарностью вспоминать об их добре и стараться подражать их назидательным обычаям и поддерживать их [15].

Што тычыць адносін хрысціяніна да самога сябе, то яны ў значнай ступені выцякаюць з адносін да Госпада і да бліжніх яму людзей. У запаведзях сказана, што бліжніх патрэбна любіць, як самога сябе. Гэта значыць, што хрысціянін павінен любіць самога сябе. А з другога боку, нельга не звярнуць увагу і на тое, што той, хто правільна і законна паважае і любіць сябе, той будзе праўдзіва любіць і паважаць блізкіх. Хто адчувае неабходнасць ласкі і прабачэння самому сабе, той будзе паблажлівей адносіцца і да блізкіх людзей.

***Среди общих обязанностей христианина к самому себе можно назвать***:
– Самопознание.
– Самоуважение, соединенное с глубочайшим смирением.
– Любовь к самому себе и разумное стремление к возвышению своей жизни и своего достоинства.

*Примечание.* Частное проявление здоровой любви к себе выражается, помимо прочего, в попечении о своей душе (приготовлении ее к вечной жизни), образовании ума, воспитании воли, попечении о совести, воспитании эстетического чувства и заботе о собственном теле [15].

Важнай часткай падрыхтоўкі, канешне, было «вучэнне» пра грахоўнасць чалавека ў хрысціянстве. Тут тлумачылася найперш паняцце пра «першародны грэх» [16]. Даваліся

Репозиторий БарГУ

веды пра грахоўнасць у жыцці хрысціяніна ўвогуле, якія карэліраваліся з паняццем «страх Божы». І, канешне, называліся вядомыя сем смяротных грахоў. У праваслаўі яны наступныя: ганарлівасць (рус. *гордость*), гнеў (рус. *гнев*), зайздрасць (рус. *зависть*), гультайства (рус. *праздность*), сквапнасць (рус. *алчность*), чэраваўгоддзе (рус. *чревоугодие*), сладастраснасць (рус. *сладострастие*).

Апошняя частка праграмы навучання, якую выкладалі падчас катэхізацыі, — знаёмства з сутнасцю сакрамэнтаў. Ім паведамлялі сэнс гэтых святых дзеянняў, праз якія (як сказана ў Святым Пісанні) таемна, нябачным чынам чалавеку перадаецца ласка Святога Духа, выратавальная сіла Госпада і адбываецца сутнаснае яднанне з Богам. Усяго ў Праваслаўнай царкве маецца сем сакрамэнтаў: хрышчэнне, памазанне, пакаянне, прычашчэнне, шлюб, святарства і ялеасвячэнне.

Пералічанымі вышэй накірункамі зместу навучання падчас катэхізацыі ўся праца катэхізатара, канешне, не вычэрпвалася. Акрамя паведамлення гэтых ведаў абвешчанаму прадстаўнікі царквы ў старажытнасці павінны былі сабраць звесткі пра жыццё і дзейнасць чалавека, што заявіў пра сваё рашэнне прыняць хрост. Важнай задачай было высвятленне сапраўднасці намераў і шчырасці жадання хрысціцца.

Да рэалізацыі гэтай задачы, акрамя звестак, што чэрпаліся ў сацыяльным акружэнні абвешчанага, дадавалася і размова з кожным канкрэтным кандыдатам, прычым у ёй удзельнічалі не толькі радавыя святары, але і сам епіскап.

Гэта была не простая размова. Хутчэй яна нагадвала паўнавартасны іспыт, па выніках якога прымалася рашэнне аб магчымасці хрышчэння абвешчанага. Там задаваліся канкрэтныя пытанні на высвятленне валодання вывучанымі ведамі адпаведна зместу катэхізацыі, пра жыццё і дзейнасць чалавека з намерам даведацца пра тое, як ён выконваў (падчас перыяду катэхізацыі) прадпісаныя царквой малітоўныя дзеянні, ці не забываў пасціцца, ці выхоўваў у сабе якасці пакаяння і пакорлівасці, і інш.

Такім чынам, змест дзейнасці абвешчанага падчас перыяду катэхізацыі ўключаў у сябе важныя (сутнасныя) змены ў свядомасці кандыдата ў хрысціяне, а таксама ў характары яго паўсядзённага існавання. У яго жыцці акрамя новых ведаў па дактрынальных пытаннях і хрысціянскай этыцы з'яўляюцца: малітоўная дзейнасць, неабходнасць пасціцца, а таксама праца па самавыхаванні ў сабе «страху Божага», «пакорлівасці», здольнасці «пакаяння» ды іншых хрысціянскіх якасцей. Заканчвалася ўсё гэта іспытам, падчас якога, у залежнасці ад шчырасці выканання задач паўсядзённага хрысціянскага жыцця (малітва, пакаянне, пакорлівасць, пост), а таксама ад падрыхтаванасці абвешчанага ў царкоўна-хрысціянскай тэматыцы, прымалася рашэнне аб магчымасці яго ўдзелу ў сакрамэнце хрышчэння.

Сказанае вышэй адлюстроўвае так званы «поўны варыянт» зместу катэхізацыі, выкананай як бы «ў ідэале». У жыцці, на практыцы, асабліва ў старажытнасці колькасць ведаў была ў разы меншая. Ёсць нават меркаванне аб тым, што ў старажытнай царкве абвешчаным паведамлялі далёка не ўсе веды пра хрысціянства («каб не заганарыўся сваім усезнайствам»). А тое, што і паведамлялася, часцей падавалася катэхізатарамі ў якасці «сакрэтных ведаў». Для гэтага была практычная прычына, аб чым пераканаўча сведчыць прафесар А. І. Алмазаў, абапіраючыся на раннехрысціянскага пісьменніка Тэртуліяна (каля 160 — каля 220). Ва ўмовах супрацьстаяння з паганствам змест сакрамэнтаў (як і рознае іншае) быў сакрэтным, каб ён не стаў прадметам высмейвання язычнікамі, далёкімі ад разумення сапраўднай святасці: *«...пастыри... нередко видели примеры, когда непосвященные, узнавши совершение таинства, злостно осмеивали эти христианские священнодействия, даже на публичных зрелищах»* [9, с. 42].

Самае першае, чаго дабіваліся ад новаабвешчанага, — адрачэння ад антыхрыста і ад свайго мінулага грахоўнага жыцця. Ён раскайваўся ў сваіх былых грахах і памылковых поглядах, даказваў сваю вернасць Хрысту. Катэхізацыя разглядалася найперш як пакаянне, пакор-



Рэпазіторый БарГУ

лівасць, старанная малітва і строгі пост. Важным было і адкрытае публічнае следаванне хрысціянству (адкрытае спалучэнне з Хрыстом), і, канешне ж, дэманстрацыя сваёй любові да Бога.

Каб зразумець праграму зместу катэхізацыі з прывязкай да гістарычнага часу, звернемся да кнігі царкоўнага гісторыка, які грунтуецца на арыгінальным тэксце аднаго з хрысціянскіх дзеячаў IV стагоддзя, епіскапа з Іерусаліма Кірылы. Абвяшчальнае настаўленне будучым хрысціянам у перыяд жыцця Кірылы Іерусалімскага (315—386), па сведчанні прафесара А. І. Алмазава, складалася з дзвюх частак: 1) тэорыі пра пакаянне і некаторых дагматычных ісцін; 2) выкладаліся маральныя ісціны, якія Кірыл Іерусалімскі сфармуляваў у кароткіх фразах.

Працытуем гісторыка, каб больш дасканала паглыбіцца ў сутнасць тэксту яго працы (цытата дадзена ў сучаснай філалагічнай транскрыпцыі — *В. П.*): *«…огласительное наставление …прежде всего состояло из учения о покоянии, затем …учение о некоторых догматических истинах, как-то: о Боге едином и его свойствах, о том что Иисус Христос есть Сын Божий, и что он родился от Девы Марии, пострадал, претерпел крестную смерть, восприял погребение, воскресс, вознесся на небо и опять придет судить живых и мёртвых, потом о св. Духе, о бессмертии человеческой души, о теле человеческом и о Божественном Писании. Вместе с этим, далее, преподаваемы были и нравственные истины, которые у Кирилла Иерусалимского выражены кратко в следующих словах: "…избегай всякого действия диавольского; не внимай же учению звездочётов, ни птицегаданию, ни предзнаменованиям, ни баснословным эллинским прорицаниям; даже не слушай о чародеяниях, и волшебных наговорах и беззаконнейших делах совершаемых при вызывании мертвых. Презирай всякого рода невоздержания, не угождай чреву, не люби удовольствий. Будь выше страсти сребролюбия и лихоимства. Не входи в языческие собрания на зрелища, и в болезнях никогда не употребляй волшебных наговоров. Совершенно отвращайся корчемников, не уклоняйся ни к самаританству ни к жидовству…, а особенно гнушайся всяким собранием законопреступных еретиков, всемерно укрепляй душу твою сохранением постов, подаянием милостыни и чтением Божественного Писания"»* [9, с. 37—38].

Далей коратка спынімся на сутнасным напаўненні тэрміна «абвешчаны». «Абвешчанымі» (рус. *оглашенными*) у Праваслаўнай царкве, як адзначыў протаіерэй А. Ефанаў, адзін з аўтараў праваслаўнага журнала «Фама» (рус. *«Фома»*), адобранага Сінадальным інфармацыйным аддзелам Рускай праваслаўнай царквы, называюць тых, хто рыхтуецца да прыняцця *«…таинства крещения и получающие познание веры через устное научение (провозглашение)…»*. Раней, заўважае аўтар, працэс «абвяшчэння» цягнуўся доўга, перад яго пачаткам абвешчаным чыталіся спецыяльныя малітвы. *«Теперь оглашение называется катехизацией, она представляет собой несколько бесед с катехизатором, изучение основ Православия, а молитвы "о еже сотворити оглашенного" прочитываются непосредственно перед самим крещением…»* [17].

Прававы статус у абвешчаных (падкрэсліў аўтар) заўсёды быў ніжэйшы за вернікаў. Ён прыраўноўваўся да тых, хто раней за ўчыненыя грахі быў адлучаны ад сакрамэнту прычасця. У царкоўнай практыцы існуе такое паняцце, як «літургія вернікаў» (рус. *литургия верных*), калі падчас літургічнага набажэнства (відаць, у самым пачатку ажыццяўлення сакрамэнту) дыякан патрабуе: «абвешчаныя выходзьце» (рус. *оглашении изыдите*), і яны павінны разам з адлучанымі выйсці з храма да завяршэння літургіі.

Гэта рабілася ў тым ліку і для таго, каб яны зразумелі сваю непаўнавартаснасць, успомнілі свае грахоўныя ўчынкі і зразумелі, што яны (як і «мы», падкрэслівае аўтар, «кожны з нас сённяшніх людзей» у пэўных абставінах) не заўсёды вартыя Боскай літургіі — той *«…величайшей милости, которая дарована Богом для нашего спасения…»*. Каб яны («мы») шчыра раскайваліся і прыносілі годныя плады свайго пакаяння ў выглядзе выпраўлення ад грахоўнасці [17].

З цікавым і павучальным матэрыялам, датычным прадмета нашага даследавання, прыведзеным шаноўным святаром (протаіерэем А. Ефанавым), можна пагадзіцца цалкам.

Рэпазіторый БарДУ

Адзінае, што да трактоўкі тэрміна «абвешчаны» (рус. *оглашенный*), на наш погляд, неабходна, улічваючы яго архаічнасць, дадаваць таксама і спасылку на элемент грамадскага «абвяшчэння» аб намеры чалавека, які раней знаходзіўся пад уплывам язычніцкай веры. Паважаны святар, на наш погляд, даволі вузка тлумачыць тэрмін «абвешчаны» (рус. *оглашенный*): *«…получающие познание веры через устное научение (провозглашение)…»*.

Як вынікае з тэксту яго артыкула, ён ставіць знак роўнасці паміж словамі «навучанне» (рус. *обучение*) і абвяшчэнне (рус. *оглашение*, прычым чамусьці нават *провозглашение*), што, на наш погляд, не зусім карэктна. Навучанне, як вядома, гэта *«…адзінства выкладання, як дзейнасці тых хто навучае, і вучэння, як дзейнасці навучэнцаў пры перадачы ім сацыяльнага досведу…»* [18]. А вытворным для слова «абвяшчэнне» (рус. *оглашение*) з’яўляецца дзеяслоў «абвясціць» — «зрабіць галосным», гэта значыць даступным грамадскасці (напр.: *«Оглашенные (от огласить, сделать гласным), в христианской церкви лица, готовящиеся к принятию крещения и наставляемые в вере»* [19]).

Пераход насельніцтва да хрысціянства ў тую далёкую эпоху, падчас яго пачатковага, складанага (абцяжаранага жорсткай барацьбой з язычніцтвам), але «трыумфальнага» шэсця па еўрапейскім кантыненце быў сапраўднай грамадскай падзеяй, якая шырока даводзілася (абвяшчалася) грамадству найперш з мэтай пашырэння колькасці прыхільнікаў хрысціянскай царквы.

Абвешчаныя былі асобнай катэгорыяй насельніцтва, людзьмі, якія схіліліся на бок новага веравучэння, знайшлі ў сабе сілы публічна заявіць пра сваё жаданне стаць хрысціянамі. І, канешне ж, царква рэагавала на гэта вельмі актыўна, але самае галоўнае — публічна. У яе дзеяннях, накіраваных на прылучэнне новых членаў, шырокая грамадская агалоска факта абвяшчэння была выключна важнай. Яна стварала своеасаблівы «трамплін» для новага прытоку вернікаў, а значыць, яшчэ адзін пераможны рывок у барацьбе са старым, некалі магутным язычніцкім светапоглядам (і грамадска-палітычным уплывам).

Гэтая, дарэчы, думка даволі красамоўна пацвярджаецца ў сучасным электронным часопісе расійскіх стараавераў «Русская вера». Яго аўтары, у сваю чаргу, спасылаюцца на сведчанне вельмі паважанага царквой блажэннага Аўрэлія Аўгустына (354—430), які, будучы выключна знакавым дзеячам у хрысціянскім асяроддзі пачатковага перыяду, на 5-м Усяленскім царкоўным саборы (Канстанцінопаль, 553 год) быў названы ў ліку дванаццаці найбольш аўтарытэтных настаўнікаў (айцоў) царквы [20].

У тэксце часопіса стараавераў сказана: *«…Чин оглашения… в Иерусалимской и Константинопольской Церкви, совершался с большой торжественностью. В IV—V веках утвердился обычай исповедовать веру приступающих ко крещению “в словах точных и определенных, по установленной форме, при этом громко, во всеуслышание, с места возвышенного, в присутствии верующих”. О таком обычае, существовавшем в Риме, говорит блаженный Августин…»* [21].

Карацей кажучы, па сведчанні сучасніка тых падзей, блажэннага Аўрэлія Аўгустына, на якога спасылаюцца аўтары часопіса, факт галоснасці падчас далучэння новых грамадзян да ліку абвешчаных адыгрываў даволі значную ролю *«…с места возвышенного…»*, *«…*во всеуслышание…» [22, с. 187].

І рабілася гэта, на наш погляд, не проста так. Жыхары сярэдневяковых гарадоў (і сельскіх мясцовасцей) жылі даволі скучана яшчэ з першабытных часоў, калі грамадства жыло «абшчынным» спосабам ва ўмовах «суседскай абшчыны». Усё грамадскае жыццё асобнага паселішча было бачна суседзям. Людзі кантактавалі паміж сабой, абменьваліся вопытам, уступалі ў вытворчыя зносіны, разам змагаліся са стыхійнымі бедствамі (пажарамі, хваробамі, якія нярэдка дасягалі памераў эпідэмій) і г. д. Хрысціянская царква, што прэтэндавала на лідэрства ў ідэалогіі грамадства, імкнулася любымі шляхамі заявіць пра сябе. У гэтых умовах факт абвяшчэння быў, безумоўна, грамадскай падзеяй, да якой мелі адносіны не толькі выключна вернікі, але і ўсе жыхары таго ці іншага рэгіёна.

Рэпазіторый БарДУ

І гэта, безумоўна, не магло не ўплываць на цікавасць да царкоўна-хрысціянскіх падзей жыхароў, што знаходзіліся яшчэ пад уплывам паганства: што гэта за абрад такі? Што дае чалавеку вера ў адзінага Бога Ісуса Хрыста? Як гэтыя людзі жывуць, калі знаходзяцца «пад абаронай» хрысціянскіх запаветаў? Усё гэта спрыяла пашырэнню сферы ўплыву новага веравучэння і забяспечвала прыток новых вернікаў.

Нельга не заўважыць і тое, што слова «катэхізацыя», як адзначыў П. Л. Гаўрылюк, аўтар кнігі «Гісторыя катэхізацыі ў старажытнай царкве»: *«...происходит от греческого глагола “κ α τ η χ έ ω” основным значением которого в доновозаветном греческом было “оглашать”, или “сообщать широкой аудитории»... Другим, более редким в античности значением “κ α τ η χ έ ω”, получившим впоследствии широкое хождение в христианской практике, было “учить”, или “наставлять”»* [10].

Усё гэта сведчыць, што абрад абвяшчэння, акрамя непасрэдна катэхізацыі (у сэнсе навучання азам хрысціянскага веравучэння) меў найперш прадстаўніча-зазывальны характар, накіраваны на пазіцыянаванне хрысціянства ў шырокіх колах насельніцтва. А таму і найстаражытнейшы тэрмін, якім быў абазначаны названы працэс, указвае найперш на практыку абвяшчэння шырокай грамадскасці аб факце пераходу ў лона хрысціянскай царквы тых ці іншых былых язычнікаў.

Канешне, з цягам часу, калі ўсе (ці большасць) дарослых грамадзян (язычнікаў) аказаліся хрысціянізаванымі і царква пачала пераходзіць да хрышчэння дзяцей, неабходнасць у «зазывальным» характары абрада абвяшчэння паступова адпала. На першае месца у падрыхтоўцы да хрышчэння выйшла другое значэнне дзеяслова «абвяшчаць» (κ α τ η χ έ ω). Цяпер яго найперш пачалі звязваць з навучаннем (настаўленнем) азам хрысціянства пры падрыхтоўцы да хрышчэння.

Вось з гэтых часоў і адбылося паступовае зніжэнне статусу абрада абвяшчэння (рус. *оглашения*). Большасць дзяцей хрысцілі ў малалетнім узросце. Навучанне пачатковым элементам хрысціянскай веры пры гэтым таксама перастала быць асобным працэсам (да дасягнення дзецьмі падлеткавага ўзросту яно ўвогуле было непатрэбна). У малалетстве дзеці навучаліся царкоўнай абраднасці («страху Божаму», малітоўнай практыцы і інш.) найперш падчас хатняга выхавання бацькамі-хрысціянамі (а пазней і ўвогуле з'явіліся царкоўныя школы, якія пачалі больш прафесійна і шырока ажыццяўляць падрыхтоўку).

Такім чынам, адпала неабходнасць спецыяльнай дзейнасці святчэннаслужыцеляў у названым накірунку. Перыяд катэхізацыі, калі да хрышчэння выпадкова прыходзіў чалавек у падлеткавым альбо сталым узросце, скарачаўся. Такіх выпадкаў «позняга хрышчэння» станавілася ўсё менш. Так, абрад абвяшчэння (рус. *оглашения*) паступова ператварыўся ў «практыку падрыхтоўкі да хрышчэння» і ў такім выглядзе дайшоў да нашых дзён.

Яшчэ адзін аспект, дзе цяжка пагадзіцца з аўтарам артыкула ў часопісе «Фама» (протаіерэем А. Ефанавым), заключаецца ў тым, што раней (як ён сцвярджае) «абвяшчэнне» (рус. *оглашение*) лічылася «абвяшчэннем» (рус. *оглашением*), а цяпер яно называецца катэхізацыяй (рус. *катехизацией*). *«Раньше это оглашение длилось продолжительное время, перед его началом над оглашенными прочитывались специальные молитвы. Теперь оглашение называется катехизацией...»* [17].

Справа ў тым, што катэхізацыяй перыяд абвяшчэння называўся заўсёды, з самага пачатку (з часоў старажытнай царквы). І не таму, што ён працягваўся «доўга» ці «коратка» па працягласці. Катэхізацыяй ён называўся з-за таго, што грэчаскі дзеяслоў κ α τ η χ έ ω меў другое (пасля «абвяшчаць») значэнне — навучаць («настаўляць»). І, канешне, аднакарэннасць (ці, дакладней, падобнасць па форме) з грэчаскай першаасновай прывяла да ўтварэння (у нашай традыцыі) лексемы «катэхізаваць», якая пазней заняла раўназначнае становішча ў славянскіх мовах разам з дзеясловам «абвяшчаць» (рус. *оглашать*).

Катэхізацыяй ён называўся тады, як, дарэчы, і цяпер, таму што галоўная сутнасць «абвяшчэння» (рус. *оглашения*) у сэнсе «навучання» (рус. *наставления*) — гэта знаёмства



Репозиторий БарГУ

будучага верніка са зместам элементарных асноваў хрысціянскай дактрыны (і царкоўнай абраднасці), якая з даўніх часоў выкладалася па спецыяльнай, зразумелай для малапісьменнага (а часцей і зусім непісьменнага) насельніцтва методыцы: у форме кароткіх пытанняў і адказаў.

Менавіта форма пытанняў і адказаў, згодна з якой будаваліся дапаможнікі па хрысціянізацыі насельніцтва, і называлася «катэхізічнай». Інакш, катэхізіс — гэта ўстойлівая, гістарычна ўзнікшая форма дапаможніка для выкладання хрысціянскага веравучэння, якая была пакладзена ў аснову хрысціянізацыі з самых часоў пачатковай (старажытнай) царквы. Яна пазней распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе (у Беларусі ў тым ліку) і дайшла да нашых дзён [23]. Таму працэс навучання новадалучаных да хрысціянства вернікаў на стадыі іх абвяшчэння называўся катэхізацыяй.

Іншым чынам (акрамя кароткіх пытанняў і адказаў) непісьменнаму прадстаўніку насельніцтва ранняга сярэднявечча растлумачыць сутнасць хрысціянскай дактрыны было нельга. Толькі пытанне і адказ. Потым, відаць, гэтыя шаблоны былі запісаныя і атрымалі ўсеагульнае распаўсюджанне.

Цікава, дарэчы, і тое, што самая старажытная надрукаваная на тэрыторыі Беларусі (на старабеларускай літаратурнай мове) кніга — таксама «Катэхізіс». Ён быў выдадзены ў Нясвіжы ў 1562 годзе асветнікам беларускай зямлі, адным з дзеячаў эпохі Адраджэння, працы якога былі шырока вядомыя ў розных краінах тагачаснай Еўропы, нашым слынным земляком — Сымонам Будным (каля 1530—1593) [24].

Сымон Будны, дарэчы, ведаючы, што галоўнае адрозненне такой навучальнай кнігі, як катэхізіс, — яе выкладанне ў форме пытанняў і адказаў, падкрэсліў гэтую асаблівасць нават у назве кнігі: «Катихисисъ, то есть наука стародавная хрістіаньская от Светого Писма для простыхъ людей языка руского въ пытаніахь и отказехъ събрана» (падкрэслена аўтарам — *В. П.*).

**Заключэнне.** Адзін са старажытных абрадаў у дзейнасці царквы (чын абвяшчэння), які ўзнік у перыяд станаўлення хрысціянскай рэлігіі ды існаваў на працягу многіх стагоддзяў, у цяперашні час перажывае моцнае зніжэнне статусу (аж да страты самога тэрміна «абрад»). Цяпер гэта называецца «практыка падрыхтоўкі да хрышчэння», якая займае дастаткова абмежаваны перыяд часу і прымяняецца ў пэўных сітуацыях даволі сімвалічна.

Галоўнай задачай абраду абвяшчэння (катэхізацыі), пачынаючы з часоў яго ўзнікнення, была перыярыентацыя чалавека, які знаходзіўся ў палоне язычніцкага светаўспрымання, на шлях хрысціянізацыі.

Уся праца прадстаўнікоў царквы (катэхізатараў) падчас даволі працяглага (у старажытнасці) перыяду абвяшчэння была накіравана на змяненне свядомасці, вобразу жыццядзейнасці, комплексу маральных, культурных і светапоглядных арыенціраў чалавека ў накірунку хрысціянскага вобразу мыслення, жыццядзейнасці і светаўспрымання.

Змест праграмы катэхізацыі (у яе поўным «ідэальным» выглядзе) заключаўся ў навучанні абвешчаных («Сімвал веры», малітва «Ойча наш», «Дзесяць біблейскіх запаведзяў», «адносіны з Госпадам», «унутранае і знешняе богапачытанне», адносіны да бліжніх і да самога сябе) базавым (элементарным) ведам, патрэбным любому хрысціяніну. А таксама прывучэнню чалавека да своеасаблівага вобразу жыцця, адпаведнага хрысціянскім традыцыям (уключаючы «пакорлівасць», «страх Божы», «пакаянне» і «пост»).

У змесце тэрміна «абвяшчэнне» (рус. *оглашение*), які спрадвеку ўжываўся для абазначэння перыяду катэхізацыі, неабходна ўлічваць (акрамя непасрэдна навучання кандыдата ў члены хрысціянскай супольнасці) сацыяльна-палітычную зацікаўленасць царкоўнага кіраўніцтва ў публічнай аб’яве (трансляцыі ў свядомасць шырокай грамадскай супольнасці) факта намеру чалавека, які раней знаходзіўся пад уплывам паганства, далучыцца да хрысціянскай царквы, ад чаго залежала павелічэнне колькасці ахвочых прыняць хрысціянства.

Репозиторий БарГУ

Больш інтэнсіўнае ўпамінанне ў сучаснай царкоўнай практыцы тэрміна «катэхізацыя» ў параўнанні з (амаль забытым цяпер) тэрмінам «абвяшчэнне», не звязана з працягласцю сучаснага перыяду перадхрышчэнскай падрыхтоўкі, як лічаць некаторыя.

Абодва тэрміны вытворныя ад грэчаскамоўнага дзеяслова κ α τ η χ έ ω. З іх «абвяшчэнне» быў больш распаўсюджаны на пачатковым этапе да той пары, пакуль царква (па прычыне наяўнасці вялікай колькасці нехрысціянізаванага насельніцтва) была зацікаўлена і выкарыстоўвала шырокую агалоску факта жадання язычніка перайсці ў шэрагі хрысціян: *«…с места возвышенного…»* і *«…во всеуслышание…»*.

А тэрмін «катэхізацыя» замацаваўся ў славянскіх мовах з-за аднакарэннасці з грэчаскім дзеясловам і перакрыў па распаўсюджанасці тэрмін «абвяшчэнне» пасля таго, як дарослых язычнікаў амаль не засталося, публічная заява аб адрачэнні ад язычніцтва стала непатрэбнай (абсалютная большасць грамадзян ужо былі хрысціянамі), а засталося толькі «катэхізаваць» — «навучаць» азам хрысціянства малалетніх.

Неабходна акрамя сказанага звязваць дзеяслоў «катэхізаваць» з назоўнікам «катэхізіс». Катэхізіс — гэта дапаможнік у практыцы навучання хрысціян-неафітаў. Яго спецыфіка — у спецыяльнай форме выкладання матэрыялу, якая будуецца ў выглядзе пытанняў і адказаў. Катэхізаваць — навучаць з дапамогай пытанняў і адказаў, прычым названая форма не выдуманая адвольна. Яна была прадыктавана ўмовамі станаўлення хрысціянскага светаўспрымання.

Царква працавала, асабліва на пачатковым этапе (у старажытнасці) галоўным чынам з непісьменным язычніцкім насельніцтвам, навучыць якое, акрамя як у форме пытанняў і адказаў, было немагчыма.

Тытульнае пытанне нашага даследавання: чаму старажытны царкоўны абрад абвяшчэння да сённяшніх дзён зазнаў моцнае зніжэнне свайго статусу, страціў нават прыналежнасць да пераліку абрадаў і ператварыўся ў «практыку падрыхтоўкі да хрышчэння»?

Зніжэнне статусу адбылося ў выніку завяршэння хрысціянізацыі абсалютнай большасці дарослага насельніцтва. Дзяцей пачалі хрысціць у малалетнім узросце. Навучанне асновам веры ў ранейшым выглядзе стала непатрэбным. У малалетстве дзеці навучаліся царкоўнай абраднасці (малітоўнай практыцы, «страху Божаму» і інш.) найперш падчас хатняга выхавання бацькамі-хрысціянамі. А пазней і ўвогуле з'явіліся царкоўныя школы. Неабходнасць у спецыяльнай катэхізацыйнай дзейнасці святароў практычна адпала. Абрад абвяшчэння (рус. *оглашения*) паступова ператварыўся ў «практыку падрыхтоўкі да хрышчэння», якая існуе ў сучаснай царкве.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Августин Иппонийский (гг. ж.: 354—430) «О символе веры к катехуменам» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://ekzeget.ru/bible/2oe-poslanie-k-timofeu-ap-pavla/glava-2/stih-13/ . — Дата доступа: 11.09.2023.

2. Василий Великий (гг. ж.: ок.: 330—379) «О крещении» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://svyatye.com/Sviatitel-Vasilii-Velikii/O-kreshchenii/ . — Дата доступа: 24.07.2023.

3. Диодох Фотикийский (гг. ж.: ок. 400—474) «Катехизис» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Diadoh_Fotiki/katehizis/. — Дата доступа: 19.06.2023.

4. Иоанн Златоуст (гг. ж.: ок. 347—407) «Слова огласительные» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Ioann_Zlatoust/oglasit/ . — Дата доступа: 23.05.2023.

5. Оглашение [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/oglashenie . — Дата доступа: 29.08.2023.

6. Иреней Лионский. Доказательство апостолькой проповеди [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Irinej_Lionskij/apostolic_preaching/ . — Дата доступа: 03.09.2023.

7. Большое огласительное слово святителя Григория Нисского [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Grigorij_Nisskij/bolshoe-oglasitelnoe-slovo/ . — Дата доступа: 08.09.2023.

8. Кирилл Иерусалимский. Поучения огласительные и тайноводственные [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Kirill_Ierusalimskij/oglasit/ . — Дата доступа: 03.09.2023.

9. *Алмазов, А. И.* История чинопоследований: крещения и миропомазания / А. И. Алмазов. — Казань : Тип. Императорского Ун-та, 1884. — 782 с.

10. *Гаврилюк, П. Л.* История катехизации в древней церкви / П. Л. Гаврилюк / под ред. свящ. Георгия Кочеткова. — М. : Свято-Филарет. моск. высш. православ.-христиан. школа, 2001. — 320 с.

11. *Daniélou, J.* La catéchèse aux premiers siècle / J. Daniélou // Rédigé par Régine du Charlat ; Collection *Ecole de la foi*. — Paris : Fayard — Mame, 1968. — 267 p.

12. *Пілецкі, В. А.* Пра замежную гістарыяграфію абраду «абвяшчэння» / В. А. Пілецкі // Интернаука. — № 37 (307), ч. 3. — М. : Интернаука, 2023. — С. 44—48.

13. Молитва «Символ веры» на русском языке [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.krestim-detok.ru/blogs/blog/simvol-very-etu-molitvu-nado-vyuchit . — Дата доступа: 29.08.2023.

14. Десять заповедей Закона Божьего [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://pravoslavie.ru/104777.html . — Дата доступа: 09.09.2023.

15. Обязанности христианина по отношению к Богу [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/obyazannosti-xristianina . — Дата доступа: 29.08.2023.

16. Упершыню тэрмін «першародны грэх» быў уведзены ў шырокі ўжытак у працы: Блаженный Аврелий Августин. О различных вопросах к Симплициану [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Avrelij_Avgustin/o-razlichnykh-voprosakh/1_2_6 . — Дата доступа: 25.03.2023.

17. *Ефанов, А.* Кто такие оглашенные? [Электронный ресурс] / А. Ефанов. — Режим доступа: https://foma.ru/kto-takie-oglashennyie.html . — Дата доступа: 01.08.2023.

18. Обучение [Электронный ресурс] // Рос. пед. энцикл. — Режим доступа: https://www.klex.ru/8me . — Дата доступа: 25.08.2023.

19. Оглашенные [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://1598.slovaronline.com/ . — Дата доступа: 24.08.2023.

20. Блаженный Аврелий Августин [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Avrelij_Avgustin/ . — Дата доступа: 12.07.2023.

21. Чин оглашения [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://ruvera.ru/oglasheniye https://ruvera.ru/oglasheniye . — Дата доступа: 01.05.2023.

22. Исповедь блаженнаго Августина, Епископа Иппонийскаго : в 13 книгах ; новый пер. — М. : Тип. т-ва Рябушинских, 1914. — 442 с.

23. *Клімаў, І. П.* Беларускія і украінскія катэхізісы XVI—XVIII ст.: крытэрыі адбору помнікаў (некаторыя метадалагічныя заўвагі) / І. П. Клімаў // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі : зб. навук. арт., прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2007.

24. Катэхізіс: помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. адаптаваны тэкст, пер. са старажыт. беларус. мовы Н. Кабелка / рэдкал.: Н. Кабелка (навуковы рэд.) [і інш.]. — 2-е выд. — Мінск : Юніпак, 2005.— 312 с.

Паступіў у рэдакцыю 13.10.2023.

Репозиторий БарГУ